# Астана — Мінск

**У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь на прэзентацыі літаратурнага альманаха «Казахстан — Беларусь» паэтэса і публіцыстка Любоў Шашкова, якая працуе намеснікам галоўнага рэдактара літаратурна-мастацкага часопіса «Простор» (Астана, Казахстан), уручыла ўзнагароды беларускім пісьменнікам і бібліятэкарам.**

— Прыемна выканаць ганаровую місію, якую мне даручыла кіраўніцтва нашага аўтарытэтнага навукова-практычнага даследчыцкага цэнтра — Інстытута літаратуры і мастацтва імя Мухтара Аўэзава Камітэта навукі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Казахстан, — зазначыла Любоў Канстанцінаўна. — Перадаю дыпломы інстытута, якія падпісаны дырэктарам Кенжэханам Матыжанавым, аўтарытэтным вучоным, доктарам філалагічных навук, заслужаным дзеячам Казахстана. Дыпломамі за вялікі ўклад у развіццё беларуска-казахскіх літаратурных сувязей адзначаны дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч і намеснік дырэктара Аляксей Чарота, намеснік дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Людміла Кароль, дырэктар Мінскай гарадской дзіцячай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Таццяна Швед.

— Мы ў сваю чаргу хацелі б засведчыць, што казахская літаратура і ў постсавецкі час дастойна прадстаўлена ў Беларусі, — у слове ўдзячнасці выказаўся Алесь Карлюкевіч. — За апошняе дзесяцігоддзе ў нас у перакладзе на беларускую мову выдадзены кнігі Абая «Стэпавы прастор», Немата Келімбетава «Не хачу губляць надзею», «Лісты сыну», «Зайдрасць», дзве першыя кнігі М. Аўэзава, прысвечаныя легендарнаму Абаю, анталогія твораў сучасных беларускіх і казахскіх пісьменнікаў на рускай мове «Не ведая границ» у серыі «Созвучие сердец: Беларусь — Казахстан». Шмат публікацый з'явілася ў беларускім перыядычным друку. Найперш — у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Нёман».

Рэгулярна праходзяць прэзентацыі кніг казахскіх аўтараў у самых розных бібліятэках краіны. А ў фондах Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага пэўнае месца займаюць творы пісьменнікаў Казахстана, выдадзеныя ў Мінску, Маскве, Казахстане, дарэчы, на казахскай мове — таксама.

**Сяргей ШЫЧКО**